Следства па справе Алега Дэйкі зноў аднаўлена стр.2
Список резерва кадров на должности начальников стр.3
Ахвяры ашуканства варажбітак стр.5




Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская


№ 8 (141). 17 — 23 лютага 2000г. Незалежны грамадска-палітычны штотыднёвік Кошт 60 руб.




Виталий Хомяков

ИХ НАШЛИ ЧЕРЕЗ ДЕВЯТЬ МЕСЯЦЕВ

В прошедшую субботу в Слониме похоронили 22-летнего Виталия Хомякова и 21-летнего Анатолия Фидрика, которые до 10 февраля 2000 года считались без вести пропавшими.


Анатолий Фидрик




Фота Віталя ГІЛЯ

Напомним, что в полночь 9 мая 1999 года они вышли с неизвестной девушкой из дискобара "Оскар". После этого живыми их больше никто не видел. По данному факту прокуратура возбудила уголовное дело. Принятые меры по розыску результата первоначально не дали. И только в начале февраля 2000 года органы получили оперативную информацию о лицах, которые могли убить Хомякова и Фидрика. Проанализировав ее, начальник Слонимской милиции Ярослав Халецкий, прокурор Анатолий Явлаш и начальник отделения уголовного розыска Сергей Мороз спланировали соответствующие мероприятия. В течение последующих трех суток было установлено, что к их смерти причастны рабочий мебельной фабрики Владимир Расол, неработающий Анатолий Зенов, слесарь моторомонтного завода Сергей Кринчик и бывший участковый инспектор милиции Сергей Новиков.

10 февраля один из подозреваемых показал место, где были спрятаны тела Виталия и Анатолия. Их нашли на старом татарском кладбище, расположенном в 4 км от Слонима. Подозреваемые в совершении преступления задержаны. Сотрудники милиции также установили личность девушки, с которой Хомяков и Фидрик покинули дискобар "Оскар". Это — жительница Барановичей 21-летняя Елена Павлова.

Как все было на самом деле, покажет следствие.

Валентин ЧУРИЛО

НОВОСТИ

Чиновников будут сокращать

Как сообщила пресс-служба президента, Александр Лукашенко поручил министру финансов Николаю Корбуту заниматься поиском дополнительных, "в том числе нетрадиционных", источников пополнения доходной части бюджета 2000 года и мер по сокращению расходов.

Он также поручил Министерству финансов разработать предложения по сокращению на 10 процентов расходов на содержание управленческого аппарата. Эти средства предполагается направить на финансирование социальной сферы.

***

По данным Минюста, в прошлом году к уголовной ответственности было привлечено 6 тысяч 110 несовершеннолетних, в том числе 3 тысячи 614 учащихся школ и профессионально-технических училищ.

Праздновать так праздновать

Александр Лукашенко своим указом ввел в стране еще ряд профессиональных праздников.

Так, 19 января будет отмечаться День спасателя, 30 июня — День экономиста, 23 августа — День работников государственной статистики, 6 октября — День архивиста и 14 октября — День стандартизации.

В соответствии с указом, профессиональный праздник работников торговли отделен от праздника работников бытового обслуживания населения и жилищно-коммунального хозяйства (четвертое воскресенье марта) и перенесен на последнее воскресенье июля.

Помимо этого, в стране вводятся дни потребителя и охраны окружающей среды, которые будут отмечаться соответственно 15 марта и 5 июня.

***

В этом году уровень оплаты населением коммунальных услуг планируется увеличить с 15 до 35 процентов от их реальной стоимости, а в течение 2001 года — до 80 процентов.

Об этом заявил министр жилищно-коммунального хозяйства Беларуси Александр Милькота. По словам министра, увеличение оплаты населением коммунальных услуг — вынужденная мера, которая позволит снизить нагрузку с бюджета.

БелаПАН

ПРАТЭСТ СУПРАЦЬ ЗБЯДНЕННЯ НАРОДА

13 сакавіка ў Слоніме прайшоў пікет супраць росту цэн і збяднення насельніцтва Беларусі. Ён быў арганізаваны сябрамі БНФ і прадстаўнікамі незалежных прафсаюзаў.

На працягу дзвюх гадзін удзельнікі мерапрыемства раздавалі прахожым адмыслова падрыхтаваныя ўлёткі, у якіх, між іншым, ёсць і такія словы: "Нашы пенсіянеры атрымліваюць такія мізэрныя надбаўкі да пенсіі, за якія не купіш нават туалетнай паперы. Нас пазбавілі права выбіраць кіраўнікоў. Цяпер яны адчуваюць сябе ўсясільнымі царамі... Толькі разам, згуртаваўшыся, мы абаронім сябе!".


Фота Віталя ГІЛЯ

А што ж сам народ? Як звычайна бывае падчас правядзення такіх акцый, думкі слонімцаў падзяліліся. Адныя казалі, што ім і так добра жывецца, другія выказвалі гатоўнасць далучыцца да пікетчыкаў, але яшчэ не пераадолелі страх...

Сяргей ЁРШ

СТРАЙК НА "МАСТОЎДРЭЎ"

9 лютага работнікі лесадрэваапрацоўчага цэха, які ўзначальвае Генадзь Іванчык, ААТ "Мастоўдрэў", як толькі атрымалі разліковыя квіткі па заработнай плаце за студзень, убачылі, што налічэнні сталі значна меншымі, чым у снежні мінулага года. Яны аб'явілі страйк.

Адзінае патрабаванне, якое рабочыя вылучылі — павышэнне заработнай платы. Ініцыятары пратэсту напачатку звязаліся з адміністрацыяй прэзідэнта, але там іх далікатна адфутболілі, спаслаўшыся на тое, што "Мастоўдрэў" — акцыянерное таварыства, і таму Аляксандр Рыгоравіч нічым дапамагчы не можа, але параілі звярнуцца ў рэспубліканскі канцэрн, да якога належыць аб'яднанне і які мае больш за 50% акцый гэтага прадпрыемства. Неўзабаве з'явіўся генеральны дырэктар Віктар Буры ў суправаджэнні падначаленых. Выслухаўшы крыўды рабочых, ён аўтарытэтна аб'явіў, што грошай, каб плаціць большы заробак, няма. Тады рабочыя прапанавалі яму прадаць недабудаваны катэдж, які дырэктар узвёў на сродкі прадпрыемства, сцвярджаючы, што гэтых грошай хопіць на заробак на працягу года. Напомнілі, што набытая сантэхніка для яго каштуе болей, чым выплаты дэвідэнтаў па акцыях ды згадалі пра 400-тысячныя штомесячныя заробкі трэнера мясцовай футбольнай каманды, спонсарам якой выступае ААТ. Начальства адразу пачало "апрацоўваць" калектыў на свой лад: у вас нічога не атрымаецца, няма прэсы, няма тэлебачання, тых, хто ўжывае гарэлку на працоўным месцы сталі палохаць неадкладным звальненнем. Былі і іншыя захады, каб спыніць забастоўку. Афіцыйны прафсаюз заняў, як звычайна, дваякую пазіцыю: і нашым, і вашым. Забастоўка спынілася толькі на наступны дзень, калі рабочыя атрымалі гарантыю, што заробкі будуць павышаны. Да гэтай акцыі мелі намер далучыцца рабочыя іншых цэхаў. Гэта ўжо не першае стыхійнае выступленне рабочых на прадпрыемстве.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Следства па справе Алега Дэйкі адноўлена... у чацвёрты раз

Пракуратура Гродзенскай вобласці ў чарговы раз разгледзела скаргу Дэйка Марыі Аляксееўны.

Прызнана неабгрунтаванай і адменена пастанова старшага памочніка слонімскага міжрайпракурора Яўгена Рэвуцкага ад 30.09.1999 года аб спыненні крымінальнай справы па факту смерці Алега Дэйкі ў слонімскім медвыцвярэзніку ў ноч з 5 на 6 снежня 1997 года.

Разам з тым абласная пракуратура не задаволіла просьбу Марыі Аляксееўны перадаць справу на разгляд у следчы аддзел абласной пракуратуры. Крымінальная справа накіравана для арганізацыі далейшага расследавання зноў у слонімскую пракуратуру.

Міхась ВАРАНЕЦ

Аўтапарк абараніў жыхароў раёна

Нядаўна ў горадзе былі адменены некалькі прыпынкаў прыгараднага аўтобуса Слонім — Жыровічы.

Напрыклад, перастаў спыняцца аўтобус у Рышчыцах, адкуль даволі шмат пенсіянераў ездзяць у Жыровічы, каля якіх маюць участкі зямлі. Можа гэта з'ява часовая і вясной усё зменіцца? Аказалася, што не.

Па словах намесніка дырэктара аўтапарка № 3 Валянціны Жук, прычынай гэтага кроку стала тое, што паміж гарадскім і прыгарадным транспартам існуе розніца ў коштах. А "жыровіцкі" аўтобус якраз з'яўляецца прыгарадным, хоць маршрут яго ідзе праз увесь Слонім. "Яго проста запаўнялі гараджане, а жыхары раёна не маглі заехаць дахаты", — сказала Валянціна Жук.

Сяргей ЁРШ

насвінячылі

МЯСА Ў ЛЕСЕ

Гэты здымак наш фотакарэспандэнт зрабіў 8 лютага ў лесе каля вуліцы Мінскі тракт.

Невядомы на трактары прывёз і выкінуў 12 здохлых свіней. Так проста. Выкінуў і паехаў. Чым хварэлі свінні — застаецца загадкай. Пад вечар у той дзень здыхляціну пачалі расцягваць мясцовыя сабакі. Хто гарантуе, што праз пэўны час і іх не выкінуць, як гэтых свіней?

А чаму б людзям не закапаць іх, каб зараза не разносілася не толькі па лесе, але і не трапіла ў горад. Атручваем не толькі прыроду, але і самі сябе. Тут, як кажуць, каментарый не патрэбны.

Сяргей ЧЫГРЫН



Фота Віталя ГІЛЯ

На зарплату нет денег

68 сельскохозяйственных предприятий Гродненской области имеют задолженность по зарплате еще за ноябрь прошлого года.

На начало февраля 2000 года сумма этой задолженности составляла 107 миллиардов "старых" рублей. Общая же сумма задолженности по зарплате в Гродненской области на начало февраля превышала 744 миллиарда "старых" рублей; из них две трети приходится на предприятия агропромышленного комплекса.

Проверки, проведенные в январе работниками Комитета государственного контроля Гродненской области в ряде хозяйств Мостовского, Новогрудского, Ошмянского и Сморгонского районов, подтвердили, что задолженность по зарплате образовалась из-за недостатка собственных денежных ресурсов на ее выплату. Это, в свою очередь, связано с низким уровнем производства продукции.

Ася КУНИЦКАЯ

здарэнні

Стрэл з ружжа

Жыхар Дзятлава Н. вырашыў пакончыць з сабой і выстраліў у галаву з паляўнічага ружжа.

Нанёсшы сабе страшныя раненні, гэты чалавек памёр толькі праз некалькі дзён у рэанімацыйным аддзяленні бальніцы.

Трагедыя на дарозе

На ўчастку дарогі Дзятлава — Казлоўшчына каля вёскі Хадзяўляны адбылася аварыя.

Мужчына на машыне "Жыгулі" абганяў трактар. Бачнасць была дрэнная, і ён, выехаўшы на сустрэчную паласу руху, сутыкнуўся з другой легкавой аўтамашынай. Адзін пасажыр памёр на месцы здарэння, астатнія сем былі дастаўлены ў бальніцу. Праз некаторы час памерла і маладая дзяўчына, якая ехала ў адной з машын.

Знойдзены труп

У вёсцы Касцюкі Дзятлаўскага раёна непадалёку ад свінагадоўчага комплексу калгаса "Гвардыя" знойдзены труп вартаўніка.

Відаць, чалавек памёр сам, бо прыкмет гвалтоўнай смерці не выяўлена.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Небяспечныя гульні

Двое вучняў Мастоўскай школы №5 разбілі два ртутныя тэрмометры, вылілі атруту па школе.

Ліквідацыяй небяспекі займаліся настаўнікі.

Загубіла гарэлка

Чым больш бяднейшымі становяцца беларусы, тым болей яны п'юць.

У мастоўскай лякарні ад лішняй дозы алкаголю памёр 45-гадовы мужчына.

Антон МАКЕЙ

Новы старшыня

Нядаўна адбылася змена старшыні Зэльвенскага райвыканкама.

Былы кіраўнік райвыканкама Віктар Будрэвіч вызвалены ад займаемай пасады "у сувязі з пераходам на іншую работу". А на яго месца быў прызначаны 49-гадовы Леанід Эльяшэвіч, які да гэтага працаваў старшынёй калгаса імя Леніна Шчучынскага раёна.

Алег ТАЧОНЫ

Даяркі патрабуюць большую зарплату

У панядзелак, 14 лютага, на Старадзевяткавіцкай ферме саўгаса "Слонімскі" адбыліся хваляванні даярак, якія патрабавалі большую зарплату за сваю працу.

У другой палове дня на сустрэчу з даяркамі прыехалі прадстаўнікі ўпраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкама, прысутнічала і кіраўніцтва саўгаса. Як сказала загадчыца гэтай фермы Вольга Талерчык, на Старадзевяткавіцкай ферме працуюць 25 даярак, якія ў месяц атрымліваюць па 17 тысяч рублёў. На жаль, надоі цяпер малыя, усяго 2,7 літра на карову. Гэта звязана з тым, што існуюць праблемы з кармамі. Адсюль і заробак малы. На іншых фермах нашага раёна і гэтай сумы даяркі не атрымліваюць. А што датычыць патрабаванняў рабочых, дык канфлікт ужо ўладжаны, — сказала Вольга Талерчык.

Пра тое, што канфлікт на Старадзевяткавіцкай ферме вырашаны, пацвердзіў карэспандэнту "ГС" і галоўны заатэхнік райвыканкама Алег Гедзіч.

Сяргей ЧЫГРЫН

Добрыя прадпрымальнікі ёсць і ў Слоніме

Нядаўна ў Гродне прайшло падвядзенне вынікаў абласнога конкурсу на лепшага прадпрымальніка 1999 года.

У мясцовым тэатры лялек сабралася каля 120 чалавек, прысутнічала прадстаўнічая дэлегацыя з Мінска. Лепшыя прадпрымальнікі вызначаліся ў 15 намінацыях. У намінацыі "стварэнне рабочых месцаў" першае месца заняў слонімскі прадпрымальнік Раман Гіль, а ў галіне будаўніцтва не было роўных ТАА "Зодчы" (дырэктар — Мікалай Дуброўскі). Трэція месцы ў двух намінацыях ("лепшае прадпрыемства ў галіне вытворчасці" і "стварэнне рабочых месцаў") заняла слонімская фірма "Тэлкон".

Алег ТАЧОНЫ

Идет обмен паспортов

На сегодняшний момент паспорта нового образца в Гродненской области имеют примерно 40 процентов населения региона, это второе место среди областей Беларуси.

Первые национальные паспорта были вручены в декабре 1996 года. Их обладателями стали Герой Советского Союза Иван Лебедев и олимпийский чемпион Александр Курлович. А недавно новый паспорт вручен одной из старейших жительниц Гродненской области Ольге Лацкевич, 1898 года рождения.

БелаПАН

Бяспечнасць дарослых — бяда дзецям

У Мастах хутка з'явяцца два вадаёмы. Адзін на скрыжаванні вуліц 30 гадоў ВЛКСМ і Палявой, другі — вуліцы Будаўнікоў і Станцыённай.

Гэта робіцца з мэтай асушэння прылягаючай тэрыторыі. Адрытыя катлаваны нічым не былі агароджаны, і гэта чуць не стала прычынай бяды. Вучань пачатковых класаў Мастоўскай СШ №5, якая знаходзіцца побач з вадаёмам, так спяшаўся дамоў, што вырашыў пайсці напрасткі праз катлаван ды адразу патрапіў у гразь па калені. Хлопца выцягнулі праз гадзіну, але без ботаў.

На вуліцы цёпла — у кватэры холадна

На працягу двух дзён большая частка высотных дамоў у Мастах апынулася без ацяплення і гарачай вады.

Прычынай гэтага стала аварыя цеплацэнтралі ў раёне крамы гаспадарчых тавараў па Савецкай вуліцы.

З зайздросным пастаянствам аварыі там здараюцца па некалькі разоў на год.

Язэп ПАЛУБЯТКА

"Акция любви"

По случаю Дня святого Валентина "Молодой фронт" - молодежное крыло БНФ - провел 14 февраля в Минске шествие и митинг под названием "Акция любви".

Около тысячи молодых людей с бело-красно-белыми бумажными сердечками, с национальными белорусскими флагами, флагами европейских стран и США собрались к 17 часам на площади Якуба Коласа. Оттуда колонна, скандируя "Жыве Беларусь!" и "Моладзь - за Беларусь!", распевая песни, под звон колокольчиков, с десятками включенных фонариков прошла по проезжей части улиц Красной, Коммунистической, Чичерина к театру оперы и балета. Манифестанты также несли транспаранты "Акция любви" и "I Love You".

Геннадий БАРБАРИЧ

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны: рэдакцыі............ 2-14-39
.............(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 15 лютага 2000г.
Час падпісання 16:00.
Надрукавана ў Слонімскай узбуйненай друкарні, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
Наклад 8500 экз.
Заказ № 602

E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

РЕЗЕРВ ЕСТЬ – ЗНАЧИТ НЕ ПРОПАДЁМ

На недавней сессии областного Совета депутатов была отмечена положительная работа с кадрами Слонимского горисполкома. А вот райисполком Слонимского района, отметил председатель облисполкома А. Дубко, в этом направлении не дорабатывает. По его словам, на руководящие должности там попадают иногда случайные, неподготовленные люди. Можно только догадываться, кого персонально Дубко имел ввиду.

В тоже время мы решили познакомить наших читателей с кандидатами на руководящие должности горисполкома. Это наше будущее начальство, которое уже сейчас необходимо знать поименно.

Список резерва кадров на должности председателя, заместителей председателя, управляющего делами Слонимского горисполкома по состоянию на 1 января 2000 года

№	Фамилия, имя, отчество, занимаемая должность	Год рождения	Национальность	Образование, когда и что окончил, квалификация	С какого времени работает в должности
1	Лактюшин Олег Николаевич, председатель городского исполнительного комитета	1952	русский	высшее, в 1975 г. Минский государственный педагогический институт иностранных языков, учитель иностранных языков, в 1997 году Академия управления при президенте РБ	31.03.95
				РЕЗЕРВ	
	Конон Александр Владимирович, первый заместитель председателя горисполкома	1948	белорус	высшее, в 1978 г. Белорусский политехнический институт, инженер-механик	22.05.95
	Окулик Михаил Васильевич, директор Слонимского винодельческого завода	1960	белорус	высшее, в 1982 г. Белорусский институт механизации сельского хозяйства, инженер-механик, в 1997г. Академию управления при президенте РБ, экономист-менеджер	09.09.99
	Мазаник Сергей Михайлович, начальник ДЭУ-54	1956	белорус	высшее, в 1978г. Белорусский политехнический институт, инженер путей сообщений	01.02.98
2	Конон Александр Владимирович, первый заместитель председателя городского исполнительного комитета	1948	белорус	высшее, в 1978г. Белорусский политехнический институт, инженер-механик	22.05.95
				РЕЗЕРВ	
	Мазаник Сергей Михайлович, начальник ДЭУ-54	1956	белорус	высшее, в 1978г. Белорусский политехнический институт, инженер путей сообщений	01.02.98
	Зубко Константин Сергеевич, директор Слонимского ПО ЖКХ	1950	белорус	высшее, в 1972г. Белорусский политехнический институт, инженер-механик, в 1994 г. Академию управления при Совете Министров РБ	05.12.84
3	Белянин Анатолий Васильевич, заместитель председателя городского исполнительного комитета	1948	русский	высшее, в 1971г. Белорусский государственный институт физкультуры, преподаватель физкультуры	28.08.99
				РЕЗЕРВ	
	Бадей Валерий Васильевич, заведующий отделом организационно-кадровой работы горисполкома	1967	белорус	высшее, в 1993г. Мозырский государственный педагогический институт, учитель трудового обучения и физики	27.05.99
4	Заместитель председателя горисполкома				
				РЕЗЕРВ	
	Качук Раиса Константиновна, начальник управления по экономике и рыночным отношениям горисполкома	1957	белоруска	высшее, в 1987г. Гомельский кооперативный институт, экономист торговли	01.06.95
	Сорока Владимир Витальевич, начальник управления торговли, общественного питания, товаров и услуг горисполкома	1957	белорус	высшее, в 1978 г. Белорусский государственный институт народного хозяйства, товаровед непродовольственных товаров	10.08.93
5	Новосельцева Лидия Степановна, управляющая делами горисполкома	1948	белоруска	высшее, в 1971г. Ленинградский сельскохозяйственный институт, агроном по защите растений	01.04.96
				РЕЗЕРВ	
	Денисенко Наталья Владимировна, заведующая отделом по правовой работе и организации приема граждан горисполкома	1947	русская	высшее, Белорусский государственный университет, юрист	05.10.98
	Патолятова Анна Павловна, заведующая отделом социальных проблем и общественно-политической информации горисполкома	1950	белоруска	высшее, в 1973г. Брестский государственный педагогический институт, учитель биологии и химии	05.06.96

Список резерва кадров на замещение должностей руководителей отделов, управлений, предприятий и организаций коммунальной собственности

№	Фамилия, имя, отчество	Год рождения	Национальность	Что окончил	Специальность по образованию	Занимаемая должность	С какого времени в данной должности	Состоит в резерве на должность
1	Рудак Владимир Михайлович	1974	белорус	БГЭУ	экономист	зам.начальника управления по экономике и рыночным отношениям	1998	начальник управления по экономике и рыночным отношениям
2	Воронова Ирина Николаевна	1957	русская	Ленинградский технологический институт	инженер-экономист	заведующая отделом по труду	1995	начальник управления по экономике и рыночным отношениям
3	Дубовик Жанна Геннадьевна	1970	белоруска	Белорусский институт народного хозяйства	экономист	главный специалист отдела по управлению госимуществом и приватизации	1998	заведующая отделом по управлению госимуществом и приватизации
4	Попов Сергей Александрович	1973	белорус	БАТУ, Минск	инженер-механик	главный специалист управления по экономике и рыночным отношениям	1999	заведующий отделом по управлению госимуществом и приватизации
5	Зубарева Елена Борисовна	1962	белоруска	Белорусский институт народного хозяйства	экономист	зам.начальника управления торговли, общественного питания, товаров и услуг	1994	начальник управления торговли, общественного питания, товаров и услуг
6	Мелешко Светлана Михайловна	1965	белоруска	БГЭУ	экономист	главный экономист по бюджету	1995	заведующая финансовым отделом
7	Миско Елена Станиславовна	1965	белоруска	БГИНХ, Академия управления при СМ РБ	экономист, экономист-менеджер	начальник отдела планирования и экономического анализа	1998	заведующая финансовым отделом
8	Дубовик Жанна Геннадьевна	1970	белоруска	Белорусский институт народного хозяйства	экономист	главный специалист отдела по управлению госуимуществом и приватизации	1998	заведующая отделом по труду
9	Гершгорин Владислав Владимирович	1977	белорус	БГПА	инженер	специалист 1 категории	1999	заведующий отделом по труду
10	Слюсарева Любовь Ефантьевна	1951	русская	БГУ	учитель химии	директор СШ №9	1992	зав. отделом образования
11	Казакевич Татьяна Михайловна	1959	белоруска	Минский государственный педагогический институт иностранных языков	учитель английского языка	директор СШ №6	1999	зав. отделом образования
12	Михальченя Иван Чеславович	1963	поляк	ГрГУ	учитель	инспектор отдела образования	1996	зав. отделом образования
13	Рожко Ядвига Феликсовна	1960	полька	БГУ	учитель белорусского языка и литературы	гл. инспектор по назначению пенсий	1999	зав.отделом соц. защиты
14	Назаренко Инна Денисовна	1968	белоруска	Калининградский университет	учитель математики	главный инспектор по соц. защите	1998	зав. отделом социальной защиты
15	Царук Игорь Аркадьевич	1967	белорус	Брестский педагогический институт	учитель физкультуры	тренер-преподаватель ДЮСШ №2	1991	зав. отделом по физической культуре, спорту и туризму
16	Петручук Василий Павлович	1955	белорус	БИСИ	инженер-строитель	начальник МПМК-164	1998	начальник УКСа
17	Лычковская Светлана Валентиновна	1960	белоруска	БрИСИ	архитектор	архитектор «Гродножилпроект»	1995	начальник управления архитектуры и градостроительства
18	Козырнович Лилия Михайловна	1952	еврейка	БИСИ	архитектор	архитектор проектного бюро	1996	начальник проектного бюро
19	Климко Зинаида Владимировна	1952	белоруска	Пинский совхоз-техникум	техник-землеустроитель	специалист 1 категории отдела по землеустройству	1999	зав. отделом по землеустройству
20	Цавалюк Людмила Ивановна	1952	украинка	Львовский торгово-экономический институт	техник-землеустроитель	ведущий специалист по учету и распределению жилой площади	1998	зав. отделом по учету и распределению жилой площади
21	Лис Олег Владимирович	1971	белорус	БГУ	географ-преподаватель	гл. специалист по работе с молодежью	1999	зав. отделом организационно-кадровой работы
22	Фидрик Александр Львович	1973	белорус	БГПА	инженер-механик	главный специалист организационно-кадровой работы	1999	зав. отделом организационно-кадровой работы
23	Рагозик Наталья Владимировна	1971	белоруска	ГрГУ	учитель истории	1 секретарь ГК БПСМ	1997	зав. отделом социальных проблем и общественно-политической информации
24	Лис Олег Владимирович	1971	белорус	БГУ	географ-преподаватель	гл. специалист по работе с молодежью	1999	зав. отделом социальных проблем и общественно политической информации
25	Новосельцева Оксана Васильевна	1978	белоруска	ГрГУ	учитель	гл. специалист отдела ЗАГС	1998	зав. отделом ЗАГС
26	Ступакова Галина Андреевна	1961	белоруска	Минский кооперативный техникум; культпросветучилище	товаровед; режиссер	специалист 1 категории отдела ЗАГС	1988	зав. отделом ЗАГС
27	Цыпурко Владимир Алексеевич	1967	белорус	БГУ	юрист	гл. специалист отдела по правовой работе	1998	зав. отделом по правовой работе и организации приема граждан
28	Цыпурко Владимир Алексеевич	1967	белорус	БГУ	юрист	гл. специалист отдела по правовой работе	1998	зав. общим отделом
29	Лис Олег Владимирович	1971	белорус	БГУ	географ-преподаватель	гл. специалист по работе с молодежью	1999	заведующий общим отделом
30	Гончарик Нина Николаевна	1954	белоруска	БИСИ	инженер-строитель	заместитель директора ПО ЖКХ	1994	директор ПО ЖКХ
31	Шлемен Владимир Петрович	1944	белорус	БПИ	горный инженер	гл. инженер ПО ЖКХ	1998	директор ПО ЖКХ
32	Афанасик Василий Владимирович	1958	белорус	БГУ	журналист	зам. редактора газеты «Слонімскі веснік»	1986	главный редактор газеты «Слонімскі веснік»
33	Запрягаев Юрий Феликсович	1967	белорус	ГрМИ	врач-лечебник	гл. врач противотуберкулезного диспансера	1995	главврач ТМО
34	Халупко Юрий Константинович	1966	белорус	ГрМИ	врач-лечебник	зам. главврача по ВТЭ и реабилитации	1999	главврач ТМО
35	Скорая Галина Николаевна	1947	белоруска	Минский финансовый техникум	финансист	зав. Механической прачечной	1978	директор КБУ
36	Яговдик Татьяна Михайловна	1961	белоруска	БГИНХ	товаровед	товаровед КШП	1992	директор КШП
37	Веснина Зинаида Владимировна	1949	белоруска	Гродненский политехнический техникум	техник-строитель	ст. мастер МБРТИ	1997	начальник МБРТИ

Газета Слонімская
17 — 23 лютага, 2000г. № 8 (141)

Спасибо, добрые люди!

Пришла я в обувную мастерскую, чтобы рассчитаться за услуги. Сапоги уже в сумке. Руку — в карман, а там нет кошелька с деньгами. Не знаю, что подумал мастер, но я была просто в шоке. Когда вернулась домой, внучка мне сказала, что звонили женщины, которые нашли кошелек.

Звоню Зинаиде Егоровне Сидоровой, которая живет на улице Пушкина. Она обрадовала меня, что кошелек мой нашелся, но он находится у другой женщины, ее подруги. Не прошло и нескольно минут, как мне позвонила Нина Ивановна Броновицкая, которая живет на Фабричной улице в Альбертине. Она сообщила, что кошелек у нее, и я могу его забрать в любое время.

Из рассказов этих женщин я узнала, что они ходили в горсобес, в экскурсбюро вдвоем, чтобы узнать мой адрес или телефон. Эти женщины пенсионного возраста затратили много времени, чтобы меня найти. В кошельке было полмиллиона рублей, удостоверение экскурсовода и пенсионное удостоверение.

Я очень благодарна этим двум женщинам, Нине Ивановне и Зинаиде Егоровне, за их честность и доброту. Они даже не взяли предложенное мною вознаграждение. Желаю им крепкого здоровья и семейного благополучия.

Елена ФЕДОРУК

Я люблю вас, слонимчане

Дорогие мои слонимчане, я вас очень люблю и очень люблю свой город.

Каждый человек — это непрочитанная книга, хорошая или плохая. Я слонимчанка и училась в СШ №6. Не буду говорить о знаниях, они давались всем по-разному, а вот культура поведения... Наше время дало нам прекрасных учителей. Вот слова одного их них: "Не тот учитель, который учит, а тот, у которого учатся". Мужчины моего поколения пропустят женщину вперед, подадут ей руку при выходе из автобуса, уступят место. Недавно в "Газеце Слонімскай" директор автопарка №3 сказал, что наши автобусы на грани исчезновения, что скоро не будет на чем ездить. Ну что ж, будем ходить пешком. Я не упрекаю ни директора, ни водителей, что нет денег на запчасти. Понятно, что не их вина — такое наше время. А вот давайте заглянем в салон того же автобуса! Боже! Чего только не написано в салоне: автографы недозрелых "художников", имена, нецензурщина, а сколько сидений изрезано!.. Это сидит какой-то балбес, его везут, а он режет, рвет, лепит жвачки. В нашем автопарке есть красивый автобус, который в народе называют "титаник", большой, с бархатными сидениями. Он где-то прослужил много лет и к нам пришел как новенький. Я обращаюсь к вам, молодые, умные, красивые и здоровые, не портьте то, что вам принадлежит. Будьте внимательны и культурны, относитесь к своему городу с любовью и уважением. Ведь пошлость и культура находятся на одних весах, только с разных сторон. Давайте любить свой город! Посмотрите, как он красив!

Нина Степановна

Вясковы бартэр

Пачынаючы з восені, па вёсках Слонімскага (і, відаць, не толькі Слонімскага) раёна ездзяць на вялікіх "фурах" людзі, як правіла неславянскай знешнасці, і мяняюць цукар, муку і іншае на бульбу.

Вяскоўцы доўга не разважаюць: некалькі мяхоў бульбы набраў, завёз, здаў — і ўжо маеш нейкі запас той жа мукі на зіму.

Вялікі прыбытак атрымліваюць з нашай бульбы чужыя мянялы. Няўжо дзяржава не можа арганізаваць такі ж бартэрны абмен з вяскоўцамі, але на больш выгадных для людзей умовах?.. А так атрымліваецца, што нас рабуюць. Беларусь сёння — небагатая краіна, а калі яшчэ і бульбу за бясцэнак аддаваць...

Але аддаём. Восенню мянялі на кавуны. Калі ў нашу вёску Мірную прыехалі такія мянялы, то ўся вёска здавала бульбу. А мясцовыя беспрацоўнікі нават дапамагалі каўказцам грузіць яе на машыну.

Цяпер зіма, і найбольш хадавы тавар, на які мяняюць бульбу вяскоўцы, — пральны парашок і алей. За калгасную зарплату іх не накупляешся.

Алег ШЭЛЕСТАЎ, в. Мірная

Сустрэча са школай

Нядаўна ў Дзераўноўскай школе, як і ў многіх іншых школах горада і раёна, адбыўся традыцыйны вечар сустрэчы з выпускнікамі.

З гэтай нагоды альма-матэр наведала шмат выпуснікоў розных гадоў выпуску. На вечары прысутнічала многа настаўнікаў, як маладых, так і тых, чый працоўны стаж у школе налічвае некалькі дзесяткаў гадоў. Гэта — Макарэвіч Н.П., Грыцалевіч В.І., Быкава М.Н., Смірнова Т.І і іншыя. Некаторых педагогаў па нейкіх прычынах не было на вечары, але мы памятаем іх усіх. Хочацца сказаць вялікі дзякуй Іскрыку Ігару Міхайлавічу і яго жонцы Таісе Мартынаўне, Міскель Алімпіядзе Уладзіміраўне, Галожынай Ніне Сергееўне, Янушка Яніне Адамаўне, Герасік Ліліі Рыгораўне. Нізкі паклон Вам, паважаныя, за Вашу працу.

На вялікі жаль наш выпуск 1980 г. быў трошкі асірацелы. Не было з намі нашага любімага класнага кіраўніка Кухарэнкі Аляксандра Дзям'янавіча. Вялікай душы чалавек пайшоў ад нас заўчасна, але мы будзем памятаць аб ім заўсёды.

Не ўсе нашы аднакласнікі змаглі прыехаць на сустрэчу, але ўсё роўна гэта быў незабыўны вечар. Некаторыя з нас не бачылі адзін другога 20 гадоў, згубіўшы сувязі адразу пасля заканчэння школы. Было што расказаць і паслухаць аб сем'ях, аб дзецях. Доўга цягнуўся вечар, а разыходзіліся мы з адной надзеяй — сустрэцца зноў.

Святлана БОЛЦІК (ГРЫНЦЭВІЧ), выпускніца Дзераўноўскай СШ

Низкий поклон

В нашей деревне 36 жильцов, в основном, это старики и пенсионеры.

Как и многие другие деревни, наша стала забытой и заброшенной. Автобус не ходит, магазина нет, школы и библиотеки также нет. Не говоря уже о медицинской помощи. По всем вопросам мы, в основном, обращаемся к нашему председателю сельсовета А.А. Бондарю. Вот и за решением медицинского вопроса мы обратились к нему, за что очень ему благодарны. К нам начал приезжать (вернее приходить) фельдшер Николай Владимирович Жариков, удивительной души человек. В любую погоду он посещает нас. Знает недуги всех жителей, привозит лекарства.

Низкий поклон Вам, Николай Владимирович Жариков, за Ваши хорошие дела и доброе сердце.

С уважением, Кособуцкая, Григорьева, Данильчик, Сушко и другие жители д.Якимовичи

нявыдуманыя гісторыі

Добразычліўцы

На пасадачнай пляцоўцы маналітнай сцяной стаяў натоўп. Дзядзькі і цёткі, задубелыя на марозным ветры, былі злыя і гатовыя пачаць сварку нават без прычыны, а ўжо з прычынай, — то і казаць няма чаго.

Нарэшце падалі аўтобус. Кожны трымаўся на заваяванай пазіцыі і стараўся ні на крок не адступіць ад "свайго" месца, каб, як адчыняцца дзверы, што ёсць моцы пхацца наперад. Заднія напіралі на пярэдніх , а тыя, шчыльней уладкоўваючыся ля дзвярэй, старанна выціралі футрамі ды паліто брудны бок аўтобуса.

Раптам дзверы адчыніліся, і ў гэты ж час пачуўся зычны вокліч:

— Прапусціце мяне, спадары, прапусціце!

Да дзвярэй аўтобуса скрозь натоўп прадзіраўся мажны дзядзька. Быў ён з голай галавой, не гледзячы на холад, апрануты толькі ў касцюм. У руках трымаў батон і бутэльку мінеральнай вады.

— А чаму гэта мы цябе павінны прапусціць? — варухнуўся натоўп. — Ану, прэч адсюль!

— Як гэта прэч? Я тут ехаў!

— Ехаў? Ды ён, відаць, па блату раней месца заняў, нягоднік, а нам тут дубей на пляцоўцы.

— Мужык, я цябе па-харошаму прашу: не прыся, як танк, бо размова будзе кароткай.



Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Натоўп завёўся. Усе супраць аднаго. І раптам у некага мільганула здагадка:

— Ды ён жа аўтобусы пераблытаў. Так, дзядзька? Ты выйшаў за вадой і пераблытаў аўтобусы?

Але той ужо знік.

— Ах, дарма спрачаліся. Няхай бы лез, няхай бы ехаў з намі, нахабнік гэтакі, — пашкадавала высокая худая кабета.

— Ага! Трэба было прапусціць. Шкада! Хоць ты яго вярні, — падтрымаў кабету дзядзька з мяшком.

Але пярэднія пасажыры ўжо ва ўсю моц штурмавалі аўтобус і пра таўстуна з батонам хутка забыліся. А я падумала, што вельмі ж развіта ў нас пачуццё калектывізму і "добразычлівасці". Бач, вярнуць хацелі чалавека, каб у аўтобус запрасіць. І, галоўнае, што ўсе, дружна...

І мне кісялю!

У магазіне, акрамя маладзенькай прадаўшчыцы і дзвюх бабулек, якія, зрабіўшы пакупкі, размаўлялі між сабой і паволі сунуліся да выхаду, нікога не было. Раптам у памяшканне ўбег малады хлопец і гукнуў з парога прадаўшчыцы:

— Мне скрынку кісялю! І хутчэй, прыгажуня, а то вельмі спяшаюся.

Бабулі замерлі ля самага выхаду. Шорканне падэшваў і пастукванне кійкоў заціхла.

— Ой, у мяне ўжо і не набярэцца скрынка. Во, толькі гэтыя пачкі, што на вітрыне. Іх і забірайце.



Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Падэшвы па падлозе зашаркацелі хутчэй, кіёчкі пачалі дзяўбці, нібы руплівыя дзятлы.

— А навошта табе гэтулькі кісялю? — прыўзняўшы кіёк, строга спытала ў хлопца малая тоўстая бабуля.

— Але, навошта? — падтрымала яе інтарэс і другая, крышку большая і худзенькая. — Няйначай перапрадаваць будзеш, спекулянт!.. Гэта ж жарты: скрынку кісялю яму давай!

— А ты, дзеўка, навошта па столькі прадаеш у адны рукі? — накінулася тоўстая бабулька на прадаўшчыцу. — І я таксама, можа, кісялю хачу. Давай!

— І мне кісялю! — запатрабавала худзейшая. — Тры пачкі. Не, чатыры. А то і ўсе пяць. Ганна, пазыч грошай, бо ў мяне няма, — папрасіла яна ў сяброўкі.

— Пазычу, — паабяцала тая. — І сабе вазьму, няхай ляжыць дома, месца не пралежыць, а то ж гэдак усё даражэе. Зараз яго днём з агнём не знойдзеш.

— Чаму вы раней не бралі? — папракнула іх прадаўшчыца. — Былі ж у магазіне, бачылі.

— А мы і купляць не збіраліся, але раз яму цэлую скрынку, то дудкі! Не возьме!

Хлопец, не ўступаючы з бабулямі ў палеміку, выскачыў з магазіна без кісялю, а тыя, акуратна палічыўшы грошы, забралі ўвесь.


Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

нашы землякі

Валерый ХРАМАЎСКІХ:

"ДОБРА Ў ДЗЯРЖАВЕ БУДЗЕ ТАДЫ, КАЛІ БУДУЦЬ МОЦНЫЯ СЕМ'І"

Нядаўна Слонім наведаў наш зямляк Валерый Храмаўскіх. Ён з'яўляецца генеральным дырэктарам сумеснага расійска-беларускага прадпрыемства "Экран-сервіс", акадэмікам, кандыдатам тэхнічных навук, а таксама палітыкам.



Наш карэспандэнт сустрэўся з ім і папрасіў адказаць на пытанні.

— Валерый Георгіевіч, раскажыце трохі пра сябе. І як вы трапілі ў Санкт-Пецярург?

— У 1971 годзе я закончыў слонімскую чацвёртую школу. Мяне вучылі тады цудоўныя настаўнікі. Сярод іх — Мая Севасцьянаўна Хрушчова, Анісія Дзмітрыеўна Войтэнка, Пётр Дамінікавіч Байкевіч і іншыя. Я атрымаў у школе вельмі добрую адукацыю, намнога большую, чым тады атрымлівалі вучні ленінградскіх школ. У нас настаўнікі былі большымі прафесіяналамі, чым у горадзе на Няве. Таму я лёгка паступіў і закончыў Ленінградскі інстытут электроннага прыборабудавання. Застаўся працаваць на кафедры гэтай установы, дзе абараніў кандыдацкую дысертацыю.

— Чым Вы займаецеся цяпер?

— Як у Расіі, так і ў Беларусі мы сёння глядзім на Захад і вучымся працаваць так, як працуюць там. Таму і я не стаў абмяжоўвацца працай у інстытуце. Мяне запрасілі ў Расійскую акадэмію арганізацыі эканомікі і прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама ў Міжнародную акадэмію арганізацыі вытворчых сістэм. Акрамя таго, я закончыў фінансава-эканамічны інстытут. Бо, што граха таіць, сёння дацэнт вуза атрымлівае грошай менш, чым вадзіцель трамвая, гэта няправільна. Прыйшлося з калегамі ствараць прыватныя прадпрыемствы. Адно з іх сумеснае расійска-беларускае "Экран-сервіс". Праўда, у апошні час я больш займаюся палітыкай, чым эканомікай. Я ўваходжу ў каманду старшыні Расійскага парламента Генадзя Селязнёва. Але адно другому не шкодзіць.

— Вас, як расійскага палітыка, хвалюе лёс Беларусі?

— Так. Беларусь — мая Радзіма. Тут жыве мая мама, сваякі, сябры. Тут я вучыўся і рос. У мяне шмат знаёмых беларускіх палітыкаў. Калі прэм'ер-міністрам у Беларусі быў Міхаіл Чыгір, мы пачыналі наладжваць сур'ёзныя эканамічныя сувязі паміж прадпрыемствамі дзвюх дзяржаў, але яго адстаўка, як нязгода з рэферэндумам, спыніла ўсю працу.

— А як Вы ацэньваеце сённяшнюю палітычную сітуацыю ў Беларусі?

— Я цяпер магу назваць людзей, якія сёння лёгка маглі б замяніць Лукашэнку. Але гэта не для прэсы. Адно скажу, што Лукашэнка — гэта не стаўленік Расіі. Там сваіх праблем хапае. І Расію ў першую чаргу цікавіць не Лукашэнка, а тое, каб у Беларусі быў разумны і адукаваны прэзідэнт, каб гэта была дэмакратычная дзяржава, з якой лёгка было б дамаўляцца, супрацоўнічаць, кантактаваць. Прэзідэнтамі не нараджаюцца, імі становяцца. У Лукашэнкі палітычны вопыт ёсць: пяць гадоў ён быў дэпутатам, пяць гадоў ужо прэзідэнт. Адна бяда, што ў яго няма каманды. Лукашэнку патрэбен добры інстытут дарадчыкаў. Тады будзе парадак, і людзі будуць лепш жыць, і будзе дзяржава.

— У гэтай сувязі, што Вы, Валерый Георгіевіч, хочаце пажадаць сваім землякам?


— Добра ў дзяржаве будзе тады, калі будуць моцныя сем'і. Таму слонімцам і ўсім беларусам наогул жадаю, каб у іх сем'ях было ўсё ў парадку, незалежна ад колькасці грошай.

Гутарыў
Сяргей ЧЫГРЫН

ПРА "ВЕТРАЗЬ" УЖО ВЕДАЮЦЬ У ЗША

Нядаўна кіраўнік Слонімскага маладзёжнага грамадскага аб'яднання "Ветразь" Алесь Масюк пабываў у ЗША, у горадзе Чыкага. Амаль трохтыднёвая паездка стала магчымай, дзякуючы падтрымцы Амерыканскага савета па супрацоўніцтву ў галіне адукацыі. Праўда, папярэдне слонімцу давялося прайсці адбор. Ад Гродзеншчыны яго прайшлі яшчэ пяць чалавек (усе — з абласнога цэнтра).

Падчас стажыроўкі прадстаўнікоў беларускіх недзяржаўных грамадскіх арганізацый азнаёмілі з дзейнасцю амерыканскага недзяржаўнага сектара, мясцовых органаў улады, з магчымасцямі ўплыву звычайных грамадзян на правядзенне рэформаў. Беларусы змаглі пераканацца, што ў ЗША ўлады не замінаюць дзейнасці грамадскіх арганізацый. Кожны грамадзянін можа публічна выказаць свой пункт гледжання на тую ці іншую праблему і не баяцца, што яго пасля пакараюць, звольняць з працы ці арыштуюць. Напрыклад, у Чыкага Алесь Масюк стаў відавочцам дзіўнай "дэманстрацыі" — па цэнтры горада хадзіў чалавек з мегафонам, абвешаны плакатамі, на якіх былі напісаны антыпрэзідэнцкія лозунгі. Конная паліцыя, якая была побач, яго не чапала, а проста сачыла за парадкам.



Сустрэча з кіраўніцтвам горада Мэдзісан (штат Вісконсін). Алесь Масюк у цэнтры.

"А вось у нас, у Слоніме, улады вельмі часта робяць перашкоды ў дзейнасці недзяржаўных арганізацый, — гаворыць Масюк. — Пасля прэзентацыі Народнага ўніверсітэта ў клубе слонімскага быткамбіната, гарвыканкам па незразумелых прычынах адмовіў у арэндзе гэтага памяшкання, і аб'яднанню "Ветразь" давялося шукаць іншае месца. Або ў мінулым годзе, 23 верасня, я хацеў папрысутнічаць на пасяджэнні гарсавета, на якім павінна было разглядацца пытанне пра развіццё маладзёжнай палітыкі на Слонімшчыне. Аднак мяне спадар Угрыновіч "папрасіў" пакінуць залу. Чаго ён баіцца?".

У Чыкага існуе беларуская дыяспара, ёсць свая праваслаўная царква Св. Юрыя. Калісьці ў ёй служыў наш зямляк айцец Язэп Строк. Цяпер настаяцелем царквы з'яўляецца айцец Дзмітрый Башко. Царква двухпавярховая: на першым паверсе знаходзіцца зала, дзе звычайна праходзяць нейкія імпрэзы, сустрэчы эмігрантаў, а на другім — сама царква. Набажэнствы наведваюць не толькі беларусы, але і ўкраінцы, балгары. У царкве стаяць два сцягі, амерыканскі і беларускі бел-чырвона-белы. Пры царкве дзейнічае дзіцячы ансамбль "Лянок", які складаецца з дзяўчынак. Яны спяваюць беларускія песні, іграюць на цымбалах.



Станіслаў Шушкевіч выступае ў Чыкага перад яўрэйскай дыяспарай.

Алесь Масюк пазнаёміўся з некаторымі беларусамі, як, напрыклад, з вядомым грамадскім дзеячам Міхасём Каленікам. Эмігранты цікавяцца сітуацыяй у Беларусі, кажуць, што пасля соцен гадоў акупацыі, вынішчэння чужынцамі інтэлігенцыі, беларускаму народу цяжка пазбавіцца страху, праявіць свядомасць і абраць адукаванае, нацыянальнае кіраўніцтва. Але яны спадзяюцца, што калісьці сітуацыя на Бацькаўшчыне зменіцца да лепшага. Беларусы ў Амерыцы выдаюць газеты "Беларус", "Беларускі дайджэст", часопіс "Беларуская думка".

У Чыкага Масюк спаткаў і вядомага беларускага палітыка Станіслава Шушкевіча, які на працягу некалькіх месяцаў чытае ў ЗША лекцыі, выступае перад эмігрантамі. Напрыклад, на ягоную сустрэчу з яўрэямі — выхадцамі з Беларусі — прыйшло каля 300 чалавек (за некалькі дзён перад тым па мясцоваму рускаму радыё была аб'ява пра гэтую сустрэчу). Найбольш прысутных цікавілі падрабязнасці Белавежскіх пагадненняў 1991 года...

Сяргей ЁРШ

СЦЕРАЖЫЦЕСЯ ВАРАЖБІТАК

Летась чатыры жанчыны са Слонімскага і дзве з Дзятлаўскага і Зэльвенскага раёнаў звярнуліся ў міліцыю з заявамі. Яны паведамлялі, што сталі ахвярамі ашуканства з боку цыганак-варажбітак.

Многія людзі лічаць, што на падман махляра трапляюць толькі наіўныя людзі, але аказваецца, што гэта не зусім так. У рэдакцыю "ГС" прыйшла маладая жанчына, якая паведаміла, што яе ашукала цыганка, адабраўшы залатыя рэчы: пярсцёнак, завушніцы і ланцужок.



Фота Віталя ГІЛЯ

На маё пытанне, чаму яна не звярнулася ў міліцыю, а прыйшла ў газету, тая з роспачу адказала: "Вельмі сорамна, што мяне, жанчыну з вышэйшай адукацыяй, так проста ашукалі".

Жанчына расказала пра свае меркаванні наконт "цыганскага гіпнозу". Варажбітка не адразу прапанавала перадаць ёй залатыя рэчы. У першы дзень сустрэчы цыганка доўга псіхалагічна апрацоўвала жанчыну, дабіваючыся пэўнай згоды з усімі яе выказваннямі. Па словах пацярпеўшай, спачатку цыганка прытуляла яе пільнасць і ўвагу выказваннем простых выразаў, накшталт:

— Часам вы ў сваіх сямейных няўдачах абвінавачваеце сябе, — а затым чароўным голасам дадавала. — Але ж у душы вы ведаеце, што гэта не так...

Пасля некалькіх "сеансаў" увага жанчыны пачала слабець. Вулічная прадказальніца лёсу пачала варажыць па руцэ. Спачатку махлярка вадзіла пальцам па далоні жанчыны, прыгаворваючы: "Глядзі, лінія твайго жыцця заканчваецца, твой і яго шляхі скрыжоўваюцца" і г.д. Так непрыкметна гутарка непадалёку ад гарадскога рынку перайшла ў кантакт з падпарадкаваннем волі і ўвагі пацярпеўшай. Затым варажбітка блытанымі фразамі аб хваробе родных і небяспечным шляху, які яе чакае, схіліла жанчыну да ўспамінаў.

Вядома, што ў кожнага чалавека ёсць хворыя сваякі і некага чакае паездка куды-небудзь. А калі цыганка заўважыла, што погляд жанчыны накіраваны ў нікуды, не спяшаючыся зняла з яе пальца залаты пярсцёнак, паабяцаўшы, што на наступны дзень прынясе яго на тое ж самае месца.

І, сапраўды, на наступны дзень у нядзелю варажбітка ў прызначаны час зноў сустрэлася з жанчынай. Гэта выклікала давер. Пасля кароткай гутаркі ашуканка цалкам абчысціла сваю ахвяру, забраўшы ўжо ўсё золата, і знікла...

Аднак не ўсе трапляюць "пад гіпноз" ашуканак.

Нядаўна ў Слоніме на прывакзальнай плошчы да аднай настаўніцы СШ №4 падышла варажбітка і прапанавала ёй свае паслугі. Настаўніца пазнала ў ёй маці аднаго са сваіх вучняў і сама прапанавала цыганцы паваражыць. Жанчына хутка паведаміла цыганцы, у якія дні яе сын адсутнічаў у школе, колькі разоў і калі бачыла яе п'янага мужа і г.д.

Варажбітка так разгубілася, што некалькі хвілін стаяла, нібы аглушаная, а пасля, пазнаўшы ўрэшце класнага кіраўніка свайго сына, папрасіла ў яе прабачэння і сышла.

Валянцін ЧУРЫЛА

Газета Слонімская
17 — 23 лютага 2000 г., № 8 (141)

Милая, дорогая, любимая

Нина Ивановна ГОРОХ!

Искренне и сердечно поздравляем тебя с днём рождения.



Желаем от души того,
Что ценится дороже –
Здоровья, счастья, доброты
И с каждым годом быть моложе.
Неумолимые года остановить
Не в нашей власти,
Так пусть же будет так всегда:
Чем больше лет, тем больше счастья.

Любящие тебя муж, дочери и внучка Юлечка

Уважаемая

Нина Александровна КАДЫШ!

Горячо и искренне поздравляем Вас с юбилеем со дня рождения.

У Вас сегодня юбилей.
И мы от всей души желаем
Прожить Вам много-много лет,
Печали, горести не зная.
Пусть не пугают Вас года —
Ещё их сколько будет.

Пусть будут в спутниках всегда
Доброжелательные люди.
Пусть ангел Вашу жизнь хранит,
Ведь в жизни всякое бывает,
Пусть горе в двери не звонит,
А радость пусть не забывает.

Коллектив кофетерия

Любимые мамочка и папочка

Екатерина Антоновна и Николай Иосифович КОНОНОВИЧИ!

От всей души поздравляем вас с 30-летием совместной жизни.

Желаем вам счастья, радости, добра и здоровья!

Желаем вам не ведать бед,
Не знать ни горя, ни ненастья,
И чтоб хватило на сто лет
Здоровья, бодрости и счастья!

Света и Саша

Дорогая и любимая

Наталья Николаевна КОВАЛЬЧУК!

С огромной нежностью поздравляем тебя с 30-летием со дня рождения.

Для самой лучшей женщины на свете
Сегодня поздравленья пусть летят.
Тебя сегодня поздравляют:
Семья, друзья и дети.
Ведь ты — учитель, мама, друг, жена!
С юбилеем, наша милая, родная!
Огонёк ты наш, цветочек неземной.
Тебя сегодня все мы поздравляем.
Какое счастье быть всегда с тобой.

Дай Бог тебе здоровья и терпенья,
Успехов, творчества и красоты.
Пусть исполняются желания,
Будь вечно молодой ты.
Пусть солнце сияет,
Не будет ненастья,
И ангелы хранят всю жизнь тебя.
Знай: от нас зависит твоё счастье,
А наше счастье от тебя.

Муж Алексей и дочь Катя

Дорогая доченька и сестричка

Юлечка ТКАЦЕВИЧ!

Поздравляем тебя с днём рождения.

Желаем счастья, долгих дней,
Здоровья — что всего ценней,
Дорогу в жизни подлинней,
Всего хорошего на ней.

Пусть стороной обходит зло,
Пусть каждый день становится желанней.
И в жизни, чтоб всегда везло,
А счастье было гостем постоянным.

Мама, дядя Володя, брат Александр


Дорогой и любимый муж, папочка, дедушка

Александр Иванович СОКОЛОВСКИЙ!

От всей души поздравляем тебя с 55-летием.

Желаем тебе счастья, радости, добра и здоровья.

За ласку, доброту, долготерпенье,
За всё тебе благодарим.
Тебе сегодня, в юбилей твой,
Всех благ земных мы пожелать хотим.
Пусть будут счастье и здоровье,
И пусть на всё хватает сил,
И каждый день обычной жизни,
Чтоб только радость приносил.



Жена, дети и внуки Наташа, Дима, Денис, Оксана

Наша любимая и дорогая жена и мамочка

Тамара Алексеевна ЛЕОНОВИЧ!

Искренне и сердечно поздравляем тебя с днём твоего рождения.

Пусть каждый день твой светлым будет,
Не гаснет пусть твоя звезда,
Пусть радость, счастье и удача
Тебе сопутствуют всегда.

Муж, доченька, родители, свёкор, свекровь

Дорогая наша жена и мамочка

Наталья Валентиновна ГРИБ!

Поздравляем тебя с днём рождения.

Поздравляем все, любя,
С днём рождения тебя.
Будь такой же энергичной,
Молодой и симпатичной.

Твои муж и доченька Виктория

Дорогие и любимые мамочка и папочка

Нина Васильевна и Иван Иосифович ЕСМАНЫ!

От всей души поздравляем вас с 25-летием совместной жизни.



За вашу доброту, заботу
Хотим мы вас благодарить.
Собрать бы все цветы на свете
И вам, родные, подарить!
И пожелать здоровья, счастья,
Побольше радости, тепла.
Чтоб в жизни не было ненастья,
И не бежали так года.
Желаем вам, чтобы ещё долгие-долгие годы
Вы были вместе и мы рядом с вами!


С уважением и любовью к вам дочь, сын, невестка и сваха

Дорогой и любимый наш

Дмитрий ТИТОВ!

Поздравляем тебя с 20-летием со дня рождения.

Пусть в день рожденья твоего
Тепло родных тебя согреет,
А с ними не страшно ничего,
Хоть снег лежит, хоть дождик сеет.
И пусть хранит тебя Господь,
Коль это в его власти.
Здоровья, радости, любви
И много-много счастья.
Будь всегда таким же красивым и добрым.



Любящие тебя родители

Дорогая, любимая, очаровательная и нежная

Светлана Николаевна САНЬКО!

Поздравляю тебя с днём рождения.



Пусть каждый день твой
Светлым будет,
Не гаснет пусть твоя звезда,
Пусть радость, счастье и удача
Тебе сопутствуют всегда.

Любящий муж Эдуард

Елена Степановна РЫЖАК!

Любимая, хорошая, родная, тебя дороже в нашей жизни нет. Ты лучшая на свете, наша мама. У тебя сегодня юбилей.

Чтобы ты была красивой,
Всегда любимой, молодой,
В кругу семьи – всегда счастливой,
В кругу друзей – всегда простой.
Живи, родная, долго-долго
И не считай свои года.
Пусть юбилей несёт лишь счастье,
Ни капли грусти, никогда.
Душевного богатства и здоровья
Желаем мы от всей души.
Живёшь на свете ради близких,
Порою забывая о себе,
И в этот день мы кланяемся низко.
До старости глубокой и счастливой
Ты доживи и правнуков дождись,
И оставайся радостной, красивой,
Какою трудной ни была бы жизнь!



С любовью сын, дочь, невестка, внуки, сестра Валя, швагер Юра и родные

Дорогой, любимый муж, папочка, дедушка, зять и тесть

Григорий Никодимович ТИХОН!

С огромной нежностью и теплотой поздравляем тебя, наш родной, с 60-летием со дня рождения!

Мы на праздник к тебе придём,
Чтоб тебя от души поздравить,
И сердца свои принесём,
Чтобы в доме твоём оставить.
